ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
18
ЛЮТАГА
№ 4(1562)

Газета выдаецца з 1922 года.

Беларускі ўніверсітэт
тэлетайп
учора · сёння · заўтра

●●●

У ПОЛІ ЗРОКУ

членаў вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна — вынікі навукова-даследчых работ за 1987 год. Іменна на гэтым пытанні акцэнтаваў увагу ў сваім выступленні прарэктар па навуковай рабоце, прафесар С. С. Шушкевіч. Прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар У. Р. Івашын прааналізаваў прапановы факультэтаў па змене структуры кафедраў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПЕРАБУДОВЫ

вышэйшай школы, асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай літаратуры, праблемы вывучэння і выкладання старабеларускай літаратуры, духоўная культура і сучаснасць, актуальныя праблемы сучаснага літаратуразнаўства і крытыкі, культура мовы і працэс падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў — гэтыя і іншыя пытанні былі абмеркаваны на рэспубліканскай нарадзе-семінары загадчыкаў кафедраў беларускай мовы і літаратуры ВНУ БССР, якая прайшла на філалагічным факультэце. У ёй актыўны ўдзел прынялі прадстаўнікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Міністэрства асветы БССР, Інстытута літаратуры АН БССР, БДУ, Гродзенскага універсітэта, Брэсцкага педінстытута.

У дні работы нарады яе ўдзельнікі наведалі выстаўку беларускіх мастакоў у Доме мастацтваў, сустрэліся з народным пісьменнікам БССР, Героем Сацыялістычнай Працы І. П. Шамякіным, з беларускімі кінематаграфістамі, цікавай і змястоўнай была гутарка з настаўнікамі роднай мовы і літаратуры г. Мінска.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

З ЦІКАВАСЦЮ

слухалі лекцыю аб міжнародным становішчы заслужанага дзеяча культуры БССР І. А. Бейдзіна супрацоўнікі кафедраў замежных моў. Лектар выступіў перад імі на прафсаюзным сходзе, на якім былі падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за мінулы год.

Л. ВЯНЖЫЦКАЯ.

ЗАПРАШАЕ ПАЗНАЁМІЦЦА

з выстаўкай літаратуры, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння К. Каліноўскага, аддзел навуковай і мастацкай літаратуры універсітэцкай бібліятэкі. На ёй дэманструюцца кнігі, часопісы, мастацкія творы.

В. ЛЮБАЛЬ.

СЛУЖБА. АБАВЯЗАК. ЖЫЦЦЁ.

Гэта асабістае. Наша.

— САМАЯ вялікая радасць? — здзіўлена перапытваеш ты і спрабуеш прамаўчаць у адказ.

Здалося, што пытанне маё спачатку ты ўспрыняў, як бязглуздзіцу. Зусім нечакана ўзнікла яно і для мяне. Хацела адчуць услед за табой боль, горыч страты, пачуццё безабароннасці перад бяздумнай куляй... Рыхтавалася ўявіць ворагаў. Не абстрактных, з кім нярэдка змагаемся толькі на словах. Не кніжных. Звычайных. З якімі ты сустракаўся адзін на адзін, вочы ў вочы. Паспрабавала. Але ў першы ж момант, як штыкеціны агароджы, выстраіліся ў сказ суровыя словы: «Гэта асабістае. Наша».

Тады і папрасіла ўспомніць шчаслівыя хвіліны, якія адчуў за два гады службы. Нарэшце, ты знайшоў адказ:

— Калі атрымліваў пісьмо. Добра, калі тры... Аднойчы прыйшло адразу сем.

Там усё не так, як тут, у час заняткаў, залікаў, экзаменаў. Іншыя меркі. Больш глыбокія пачуцці.

— Зразумей, чалавеку заўсёды цяжка разабрацца, калі не адчуў сам,— магчыма, не жадаючы пакрыўдзіць мяне сваім маўчаннем, вымавіў ты.— ТЫМ мы можам дзяліцца толькі адзін з адным.

— А родныя?

— Толькі хвалявацца будуць. Яны ж і так неспакойна жылі ўвесь гэты час.

Служба ў арміі не гульня. Шмат думаеш. Жыццё пазнаеш хутчэй, чым дома, дзе з сапраўднымі цяжкасцямі можаш так і не сутыкнуцца. Армія — адкрытая сістэма. Там трэба змагацца. І самому адказваць за сябе і за тых, хто побач.

Сёння цябе турбуюць розныя пытанні: выхаванне падлеткаў і клопат пра маці загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў і маладых хлопцаў, якіх варожыя кулі ператварылі ў нямоглых інвалідаў. Усім хочацца дапамагчы, а часам не ведаеш, чым і як. Спадзяюся, што, як і там, у Афганістане, цяжкасці не змогуць прымусіць цябе адмовіцца ці забыцца пра тых, каму ты патрэбны.

З. МАРАВА.



НА ЗДЫМКУ: студэнт падрыхтоўчага аддзялення, былы воін-інтэрнацыяналіст Аляксандр Касцюкевіч.

Фота С. Плыткевіча.

Насустрач 70-гадоваму юбілею

23 студзеня ў працоўных калектывах нашай краіны, у тым ліку і ў БДУ імя У. І. Леніна пачаўся традыцыйны Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы, прысвечаны 70-годдзю Узброеных Сіл СССР.

АСАБЛІВАСЦЬ сёлетняга месячніка ў тым, што ён праходзіць ва ўмовах перабудовы ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства, у год правядзення XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

Мэта месячніка — далейшае ўдасканаленне работы па выхаванню працоўных, моладзі на гераічных традыцыях Камуністычнай партыі, савецкага народа, Узброеных Сіл СССР, далучэнне шырокіх слаёў насельніцтва да абаронна-масавай работы. Месячнік праводзіцца ў пярвічных арганізацыях ДТСААФ сумесна з камсамольскімі, прафсаюзнымі, спартыўнымі арганізацыямі, таварыствам «Веды», саветам ветэранаў вайны і працы. Актыўны ўдзел у гэтым важным мерапрыемстве прымаюць воіны запасу, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

У перыяд месячніка, які працягнецца да 23 лютага, запланавана правесці са студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта навукова-практычную канферэнцыю «70 гадоў на варце заваёў Вялікага Кастрычніка», лекцыі, гутаркі, даклады, палітінфармацыі, сустрэчы студэнтаў з ветэранамі вайны і працы, Узброеных Сіл СССР, наведванне памятных мясцін, мемарыяльных комплексаў Хатынь і Курган Славы. Па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа пройдуць удзельнікі «зорных» паходаў, на факультэтах і ў падраздзяленнях адбудуцца ўрачыстыя сходы, а таксама спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту. Многія з гэтых мерапрыемстваў ужо прайшлі, а некаторыя яшчэ наперадзе.

В. БЕСПРАЗВАННЫ,
член парткома.

Дзень грамадзянскай абароны

Нядаўна на факультэце журналістыкі прайшоў дзень грамадзянскай абароны. Заняткі праводзілі вопытныя спецыялісты — работнікі кафедры ГА Б. М. Зялюткін, Д. П. Аліфер і начальнік штаба грамадзянскай абароны універсітэта Л. М. Мельнікаў.

ВЫКЛАДЧЫКІ і супрацоўнікі факультэта трэніраваліся ў выкананні адпаведных нарматываў, у комплексе вывучалі парадак падрыхтоўкі і карыстання сродкамі індывідуальнай абароны, вучыліся аказваць узаема- і самадапамогу пры раненнях, пераломах і апёках, а таксама пры паражэннях радыёактыўнымі і бактэрыялагічнымі сродкамі, вучыліся рыхтаваць адзенне да абароны скуры, дзейнічаць у выпадку стыхійных бедстваў ці аварый на аб'ектах.

У ходзе заняткаў дэманстраваліся спецыяльныя кінастужкі — «Аб рэжымах радыяцыйнай абароны», «Нарматывы грамадзянскай абароны» і іншыя.

Днём грамадзянскай абароны адкрыўся месячнік абаронна-масавай работы, прысвечаны 70-годдзю Узброеных Сіл СССР, які праходзіць зараз на факультэце. У ім актыўны ўдзел прымаюць выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты.

В. ІЛЬІН.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

Грабеньчык для матэматыкаў

Нярэдка даводзіцца чуць ад студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта тлумачэнні: маўляў, нездавальняючыя адзнакі па прадмету «Ураўненні матэматычнай фізікі» паяўляюцца таму, што для далейшай работы гэтыя веды проста не патрэбны. Але ў мяне свой пункт гледжання.

Што такое УМФ як прадмет? У курсе, які прапаноўваецца студэнтам, вывучаюцца не толькі фізічныя з'явы пры дапамозе матэматычных мадэляў, але і сам апарат даследаванняў.

Студэнты часам не разумеюць, што такія прадметы, як вышэйшая алгебра, геаметрыя, матэматычны аналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні і некаторыя іншыя ў тым аб'ёме, у якім яны прапаноўваюцца на першых двух курсах,— гэта толькі азбука, пры дапамозе якой потым будзе лягчэй складаць «словы» і будаваць «сказы». Да апошніх я адношу прадмет «Ураўненні матэматычнай фізікі».

Спецыяліст, які засвоіў азбуку і некалькі словазлучэнняў, нагадвае турыста, што прыехаў за мяжу без практыкі моўных зносін. Зразумела, каб існаваць без цяжкасцей, замежніку давядзецца ўдасканальваць веданне мовы. Запэўніваць сябе ў непатрэбнасці вывучэння УМФ, на мой погляд, азначае адмаўляць у мове яе граматыку і сінтаксіс, а таксама і мэтазгоднасць пабудовы сказаў.

Я паспрабаваў знайсці ў сітуацыі, якая склалася, тыя слабыя месцы, што дазваляюць студэнтам прыйсці да памылковых вывадаў аб неабходнасці той ці іншай дысцыпліны.

Чаму выкладчыкі філасофіі на механіка-матэматычным факультэце, не ўлічваючы асаблівасці факультэта, не даюць студэнтам лагічнага абгрунтавання развіцця той ці іншай матэматычнай навукі? Частка адказнасці за пралікі кладзецца на лектараў, якія, ігнаруючы часам ідэйны бок выкладаемага матэрыялу, імкнуцца дагадзіць валу. Такім чынам, выкладчыкам, што вядуць практычныя заняткі, даводзіцца дапаўняць і філосафаў, і лектараў. Займаюся гэтым і я, але нярэдка разумею: ужо позна. Бо студэнты, як паказвае практыка, да гэтага часу прывыкаюць да штампаванай сістэмы навучання, якая прычэсвае ўсіх: і фізікаў, і лірыкаў адным грабеньчыкам. Па майму ж глыбокаму перакананню, універсітэт павінен развіваць індывідуальнасць кожнага. Вы згодны?

Ю. ПАЗНЯК,
асістэнт кафедры матэматычнай фізікі і электронікі.

АД РЭДАКЦЫІ. З аўтарам гэтага ліста-пытання цяжка не пагадзіцца. Мяркуем, што праблема паяўлення «шэрасці» у ВНУ павінна хваляваць многіх. Чакаем водгукаў аднадумцаў.

Нават калі напрагчы сваё ўяўленне, цяжка адказаць, кім можа быць гэта дзяўчына (вельмі ўжо яна па-юнацку выглядае) па прафесіі. Неаднойчы ёй самой прыходзілася бачыць рэакцыю вялікага здзіўлення, калі паведамляла: «Я — настаўніца», занадта ужо не падыходзіць яна пад традыцыйны стэрэатып школьнага настаўніка.

Так, Арына (прозвішча яна прасіла не называць, бо па яе словах, цураецца таннай папулярнасці) нядаўняя выпускніца педпатоку мехмата БДУ, сёння яна працуе ў адной з мінскіх сярэдніх школ. Спрабую вызначыць, якія праблемы хвалююць маладога спецыяліста.

— Выйсці замуж! А чаго смяешся? Не думай, што гэта не мае ніякага дачынення да прадмета нашай гаворкі. Ці ты мяркуеш, выйсці замуж — зусім не праблема? Калі я вучылася ва універсітэце, гэта мяне чамусьці не хвалявала, спадзявалася, што заўсёды не будзе позна. А калі пайшла працаваць, адразу адчула: юнацкасць мінае, кола сяброў звузілася, бо многія з іх сталі адрэзаным куском — ажаніліся ці з'ехалі па размеркаванню, альбо часу не маюць з-за працы. Новыя знаёмствы з узростам даюцца значна цяжэй. Дзе ж шукаць жаніха? У нашай школе калектыў амаль цалкам жаноцкі, сярод 120 чалавек, раз, два.., пяць мужчын выкладчыкаў...

МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ: ЯК СПРАВЫ?

«Я — настаўніца»



— Ну, а акрамя асабістых?

— Хапае. Самая галоўная, лічу, што маладога спецыяліста ніхто не выхоўвае, ніхто не дапамагае яму. Бы кінулі ў ваду і — плыві. Праўда, з адной агаворкай: шмат залежыць ад калектыву. Хаця — сустракаю многіх маладых калег — усе гавораць аднастайна па гэтаму пытанню. Добра, калі хоць па-сабачы ўмееш плаваць. І тое далёка не праплывеш. Гэта адлюстроўваецца ў зрывах, бываюць і слёзы, і крыўда.

— Скажы, дысцыпліны, закліканыя дапамагчы будучаму педагогу, цяпер табе спатрэбіліся?

— Дысцыпліны так, але не тое, што мы маглі вынесці з іх у час вучобы. Не змаглі прадметнікі з педагагічным профілем абудзіць у нас цікавасць да педагогікі. Нават і прозвішчаў не магу іх прыгадаць. На матдысцыплінах было ў многа разоў цікавей. Вельмі дапамагала практыка. Не ведаю, як зараз, але калі я вучылася, яна, на жаль, пачыналася толькі з IV курса. Упэўнена: пачынаць трэба значна раней.

— Арына, успомні свой першы ўрок.

— Вельмі баялася. Гэта памятаю добра. Паджылкі трасліся. У курс мяне ніхто не ўводзіў, пальцам паказалі на кабінет, куды я павінна была ўвайсці, дзецям нават не прадставілі.

— А як дзеці аднесліся да цябе?

— Надзіва добра. Ціхенька сядзелі. Уважліва разглядалі. Спачатку я іх была гатова ўсіх любіць як родных. А яны, чарцяняты, манілі, «праводзілі». Да гэтага цяжка было прывыкнуць. Напрыклад. Самая традыцыйная сітуацыя, у якую трапляе кожны малады настаўнік — вучань адмаўляецца даваць дзённік. Некаторыя старэйшыя выкладчыкі выходзяць з такой непрыемнай сітуацыі проста: вытрэсваюць уласнаручна партфель, нават абмацваюць, як злачынцу.

— Ну, а ты што рабіла?

— Усё, акрамя вобыску. Аднойчы сказала вучню: ці дасі дзённік, ці выйдзеш з класа цераз мой труп. Вучань плача, але дзённік не дае, мне яго і шкада, і злосць бярэ. Міма праходзіла ягоная класная. Кажа мне потым: вы яго не вельмі... Айчым у яго злосны, лупцуе. А дрэнна сябе паводзіць таму, што пасябраваў з падонкамі, якія падгаворваюць рабіць гадасці,

— Так, зразумела, настаўніку патрэбна добра ведаць сваіх выхаванцаў...

— Вельмі дапамагае у гэтым рэйд «Падлетак», калі лепшыя вучні, актыў, класны кіраўнік (мне давялося быць і класнай) наведваюць непаспяваючых ці вучняў, якія дрэнна сябе паводзяць.

— Дарэчы, мне не заўсёды былі зразумелыя гэтыя «праверкі». Тым больш, разам з вучнямі. Навошта?

— Ты сама сябе супярэчыш. Толькі што заўважыла, што выхаванцаў патрэбна ведаць! Гэта ў школе яны аднолькавыя: і форма, і падручнікі, і дзённікі. Але дома — розныя, таму што і сем'і розныя бываюць. Скажам, Пеця цэлы тыдзень нервовы, лёгка ўзрушваецца, дрэнна пачаў вучыцца. Мо у яго дома не ўсё добра? Хаця нярэдка бывае наадварот. Хатнія песцяць, вось ён і дурэе ў школе. А навошта такія рэйды сумесна з вучнямі? Згодна, дзецям іншы раз бывае і непрыемна пабачыць алкаголіка — нечага бацьку ці дрэнныя бытавыя ўмовы. Але няхай ведаюць, як жывуць людзі. Можа, пасля ўбачанага яны будуць да свайго таварыша ставіцца больш спагадліва...

— Спрэчнае выказванне. Мне падумалася: а што адчувае той, у каго у сям'і не ўсё добра, калі гэта бачаць яго таварышы з класа? Ці не адбіваецца гэта на яго гордасці, ці не будзе такі «рэйд» для яго сапраўднай драмай? Думаецца, нельга выстаўляць нечае гора на ўсеагульны агляд. Дапамагаць патрэбна, а проста глядзець — не.

Арына, скажы, а як на табе, як на асобе, адбіваецца твой прафесійны занятак? Напрыклад, ці стала ты больш цярплівай у адносінах да людзей?

— Не. Заўсёды, мяркую, была цярплівай да чалавечых недахопаў, імкнулася ва ўсякім разе. Наадварот, стала, бадай, больш рэзкай. Бо я даю веды і патрабую аддачы. Як жа інакш? Але гэта толькі ў школе. Сярод сяброў хаваю. Не хацелася, каб яны пры маім набліжэнні ўсклікалі: «Увага! Вучылка ідзе!»

— Ці значыць гэта, што ў тваім уяўленні ёсць стэрэатып «вучылкі», на які ты б нікольк не хацела паходзіць?

— Гэта выкладчык, які робіць выгляд, што ўсё на свеце ведае, які не бачыць у вучню асобы, не заўважае яго думак, толькі нешта дае, нічога не бярэ ўзамен, не вучыць думаць.

— А цябе твае вучні прымушаюць думаць?

— Асабліва калі задаюць цяжкія пытанні. Аднаго разу скардзяцца мне вучні на настаўніка: такі-сякі, маўляў. Я паабяцала разабрацца. Пытаюся: а вы ніколі не робіце памылак? Вы заўсёды ідэальныя? А яны ў адказ: «А вы ідэальная?» — «Не. Думаю, што недахопаў не пазбаўлены ніводны чалавек. Без недахопаў можа быць толькі машына. Галоўнае, асэнсаваць свае недахопы, змагацца з імі да канца жыцця...»

— А ці заўсёды ў цябе атрымоўваецца адказваць на пытанні шчыра, без хітрыкаў?

— На жаль. Неяк у мясцовы Палац культуры ў нядзелю павінны былі прыехаць самадзейныя артысты. Патрэбна было забяспечыць «гледача». А дзеці занатурыліся: «Не пойдзем. Мы ўжо дамовіліся з піянерважатай дапамагаць ёй грузіць макулатуру». Быў у маіх дзяцей «пункцік» — сабраць больш за ўсіх макулатуры, каб заняць І месца. І яны гарэлі гэтай справай. А як быць з канцэртам? Яны мне прама заўважаюць: няўжо вы сапраўды лічыце, што канцэрт больш важны за макулатуру? Тым больш, ён пэўна нецікавым будзе. Што я ім скажу? Што я павінна даваць перад завучам справаздачу не толькі за макулатуру? Што я разумею, калі мерапрыемства цікавае, дык нікога не трэба на яго цягнуць ледзь не на вяроўцы, што дзеці самі табе ўсе вушы пратрубяць?

Наогул, шмат яшчэ ў школе фармалізму. Асабліва з гэтымі мерапрыемствамі, якія ні для розуму, ні для сэрца, а для «галачкі» — з году ў год аднастайныя агляды строю і песні, што-тыднёвыя (!) конкурсы насценгазет. Іншы раз зусім даходзіць да абсурду. Было свята горада. У парку Горкага для нашай школы вылучылі месца: мы павінны былі прынесці некалькі жывёлін. Мала таго, што ў ліпені дзяцей амаль немагчыма адшукаць у горадзе, дык дзе яшчэ знайсці экзатычнага звярка? Добра, знайшоўся-такі папугайчык. А ў апошні момант паляцеў з клеткі. У выніку школа... «абняславілася», як сцвярджалі потым паўгода завуч і дырэктар. І нельга ніяк растлумачыць, што гэты непрыемны выпадак больш горшы для маленькага гаспадара птушкі, чым для ўсёй школы.

— А ці валодаеш ты ўжо сакрэтамі сваёй прафесіі?

— Напэўна, маленькімі. А наогул сакрэтаў шмат. Нават вопытныя настаўнікі са здзіўленнем іншы раз заўважаюць: падрыхтуеш і правядзеш суперцікавы ўрок, дзеці, здаецца, вельмі задаволены. А на наступны дзень робіш апытанне — па ведах «нуль». А бывае і так. Адчуваеш сябе дрэнна, урок рыхтуеш спусціўшы рукавы. На наступны дзень — амаль 100-працэнтнае засвойванне матэрыялу. Ад чаго гэта залежыць?

— Дарэчы, як ты рыхтуешся да ўрокаў?

— На падрыхтоўку ў мяне затрачваецца 3—5 гадзін. Спадручна тое, што я магу гэтыя гадзіны раскідваць на ўсе суткі. Але цяжка рыхтаваць урокі, не маючы багажу. Мне ў гэтым вельмі дапамагла ў свой час практыка ў адной з самых прэстыжных матэматычных школ (№ 19). Шмат даюць секцыі прадметнікаў. Імкнуся выкарыстоўваць элементы метаду Шаталава, на жаль, нялёгка даставаць яго апорныя канспекты.

— Карацей гаворачы, табе пастаянна патрэбна быць у «форме»...

— І імкнуцца ўвесь час запаўняць белыя плямы ў сваёй эрудыцыі. Часта ўспамінаецца вось гэты выпадак. Ехала я са сваімі «чацвёрталашкамі» ў аўтобусе — была экскурсія па памятных мясцінах горада. Набліжаемся да Оперна тэатра. Экскурсавод пытаецца: дзеці, каму гэты помнік?

— Чайкоўскаму!

— Як не сорамна! — гаворыць яна.— Мы ж усе ходзім у тэатр Оперы. Дык каму помнік?

— Горкаму!

— ...Пушкіну!

Я ўціснулася ў крэсла міжволі. Думаю, зараз хто-небудзь спытае і ў мяне, а я так і не адкажу. Вось скажы, каму гэты помнік?

Тут ужо я паціраю лоб.

— Урэшце, як ты стала настаўніцай?

— Не магу сказаць, што гэта было маёй марай з дзяцінства. Хацела паступаць у медінстытут. Адчувала, не пацягну. Маці параіла не спяшацца: папрацаваць санітаркай, падрыхтавацца. А вучылася я ў школе з матэматычным ухілам. У нашым класе амаль усе праглі паступаць. Разгубілася, няўжо толькі я не паступлю? Павагалася і вырашыла — прамая сцежка на мехмат, да таго ж там, нягледзячы на высокі конкурс, няма «блатных». Вось і адбылося...

— Не расчаравалася?

— А ты не адчула па маіх расказах? Не! У школе можна працаваць і працаваць з задавальненнем. Нягледзячы на эмацыянальныя перагрузкі, калі хочацца сядзець у цемры і цішыні, нават плакаць. Дзе ж гэтага не бывае? Да таго, што такое прызванне? Ведала я нямала дзяўчынак, якія школай проста трызнілі. Праз паўгода працы з іх засталіся ў школе адзінкі. Так што, бач, не ў адным прызванні справа. Я ўпэўнена, галоўнае, каб работа табе спадабалася, каб яна ў цябе атрымоўвалася, тады і не прыйдзецца заклікаць рабіць яе сумленна.

— Ці ўпэўнена ты, што зможаш у школе застацца да пенсіі?

—...Пакуль я малады спецыяліст і пра пенсію не думаю.

Гутарку вяла
А. ВІХРОВА.

ТВАР АЎТАРЫТЭТА

Лёс, абраны часам

Павел Паўлавіч ШУБА, прафесар, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры рускай мовы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна — ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

З вайны пачалося яго адкрыццё свету, ёю дыктаваўся яго лёс, ёю адбіраліся адзінкі вымярэння сапраўдных каштоўнасцей. За баявыя заслугі (разумеем: за яркае праяўленне савецкага патрыятызму) П. П. Шуба ўзнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Самаадданая кіраванасць да ведаў з цягам часу зрабіла Паўла Паўлавіча Шубу высокім аўтарытэтам у навуцы, любімым педагогам.

Буйны вучоны-мовазнаўца, аўтар больш 25 прац, многія з якіх з'яўляюцца фундаментальнымі, заслужаны дзеяч навукі БССР, П. П. Шуба — цудоўны арганізатар навуковай і навукова-метадычнай работы. Пад яго кіраўніцтвам і пры яго актыўным удзеле як аўтара і рэдактара друкуюцца міжвузаўскія зборнікі, комплекс вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў універсітэтаў.

Выдатнік вышэйшай адукацыі СССР, прафесар П. П. Шуба падрыхтаваў 15 кандыдатаў навук, якія працуюць у ВНУ нашай краіны і за мяжой. Ушаноўваемы сваімі вучнямі, П. П. Шуба працягвае шэсце сейбіта, мудры абавязак якога — узгадаваць асобу — настаўніка і вучонага.

Выдатнік народнай адукацыі БССР, П. П. Шуба накіроўвае працу па аказанню дапамогі сярэдняй школе ў рэалізацыі рэформы. Настаўнікам-практыкам П. П. Шуба вядомы як адзін з аўтараў шматколькасных падручнікаў і слоўнікаў. Пад яго кіраўніцтвам аўтарскія калектывы выдалі вучэбны комплекс па рускай мове для 5—6 класаў школ з беларускай мовай навучання. Падручнік «Русский язык» з гэтага комплексу ўдастоены сярэбранага медаля ВДНГ СССР.

Творца ўласных, актыўных адносін да свету і да сябе, прафесар П. П. Шуба вядзе вялікую грамадскую і прапагандысцкую работу.

За поспехі ў развіцці лінгвістычнай навукі і падрыхтоўку педагагічных і навуковых кадраў П. П. Шуба ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Мы ганарымся камуністам, ветэранам вайны, вялікім працаўніком, сціплым і добразычлівым чалавекам, чый лёс абраў час.

СУПРАЦОЎНІКІ КАФЕДРЫ РУСКАЙ МОВЫ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

З ПАЛЯВОЙ ПОШТЫ

Дзень добры!

Я ўжо было зусім страціў надзею атрымаць тваё пісьмо. Каб толькі ведала ты, які я шчаслівы зараз, калі трымаю яго ў руках! Не памятаю, ці ставіўся калінебудзь раней з такой павагай да паштальёна. Наўрад. Паўгода назад я нават не здагадваўся, колькі радасці можа прынесці канверт з маім прозвішчам. Наш старшына часам кажа: «Настрой салдата знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад трываласці яго «тылу», ад таго, што на два гады адсоўваецца так далёка, нібы ў другое жыццё.» Заняткі, кіно, дыскатэка. Гэта мае ўспаміны. Часу ўпадаць у меланхолію, вядома, не застаецца: служба. Але доўгае маўчанне блізкіх людзей для кожнага з нас пераносіць нялёгка. І днём, і ноччу, у час заняткаў і страявой падрыхтоўкі знаходзішся пад уражаннем гэтага маўчання, ламаеш галаву, што ж здарылася? Сам не раз бачыў, як прападае ў хлопцаў настрой, знікаюць з твараў усмешкі. Гэта значыць, не прыходзяць пісьмы, губляецца сувязь з «тылам».

У вас сесія... Я нават памятаю, што ў маёй групы першы экзамен 13 студзеня. Цікава, якія адзнакі хто атрымаў? Здаецца, зараз рыхтаваўся б да экзаменаў больш сур'ёзна і глыбока. Колькі часу марнаваў раней! Тут многае разумееш. Думаю, калі вярнуся, усё будзе не так. І сам перамяняюся за гэтыя два гады.

Гучыць каманда: «Адбой!» Пасля яе я яшчэ доўга мару аб сустрэчы з табой.

У. ВЕРАСЮК.

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

Далёкі, блізкі Афганістан

Магчыма, журналісты, якія працуюць на радыёстанцыях «Голас Амерыкі» і «Свабодная Еўропа», што старанна адшукваюць негатыўныя факты з нашага жыцця, гэтую навіну ўспрынялі б як асабістую абразу. Асабліва тыя, хто займаецца пытаннямі «савецкай агрэсіі ў Афганістане».

За «круглым сталом» дыскусійнага клуба «Палітыкус» гутарылі, пілі чай, спявалі песні «ахвяры» і «агрэсары». Гэты факт лёгка растлумачыць, калі ўсё паравесці з мовы радыёвайны на мову мірную, а таму і праўдзівую. У гэты вечар сустрэліся агітбрыгада афганскіх студэнтаў з Універсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы і члены Мінскага клуба воінаў запасу «Памяць», якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

— Гэтая дружба дасталася нам ад бацькоў,— так пачаў вечар Мухамос Азіз, студэнт юрыдычнага факультэта УДН, член бюро агульнасаюзнага камітэта Дэмакратычнай арганізацыі моладзі Афганістана.

Аб клубе «Памяць» расказалі гасцям яго члены Юрый Бацян, Віктар Барыла, Міхаіл Гашко, Уладзімір Данoўскі, Тарас Кецмур, Генадзь Зыль, Алег Ляшэнка.

Ён быў створаны ў 1983 годзе і аб'яднаў 400 чалавек. Асноўная работа — шэфства над сем'ямі загінуўшых, дапамога хлопцам, якія атрымалі раненні і знаходзяцца зараз у шпіталі (пры клубе створана ініцыятыўная група). Адной з асноўных задач з'яўляецца ваенна-патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне дапрызыўнікоў. Рабяты часта выступаюць перад школьнікамі і членамі ваенна-спартыўных клубаў «Юны дэсантнік».

Асаблівыя, прасякнутыя клопатам і ўвагай адносіны ў членаў клуба і маці загінуўшых воінаў.

Тарас Кецмур расказаў аб тым, як клуб арганізаваў сустрэчу Новага года для маці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Вельмі важна не пакінуць чалавека сам-насам з яго горам. А зараз і членаў клуба чакае сюрпрыз, які падрыхтавалі да 23 лютага жанчыны.

Тыя, хто служыў у Афганістане, ведаюць пра жыццё больш, чым іх равеснікі. Ім знаёма пачуццё франтавога братэрства. І пачуццё абпальваючага болю ад немагчымасці дапамагчы лепшаму сябру вярнуцца да жыцця. Яны больш сканцэнтраваныя, разумныя, грунтоўныя за многіх маіх равеснікаў.

Што адчуваюць яны, калі прыходзяць на сустрэчу з заўтрашнімі прызыўнікамі, многія з якіх не могуць сказаць нічога не толькі аб жыцці і смерці, вайне і міры, але і аб саміх сабе?

Запрасілі аднойчы Алега Ляшэнку ў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на сустрэчу з дарослымі людзьмі, якія, на яго думку, ужо павінны быць гатовымі змагацца, нават гінуць, калі патрабуе гэтага воінскі абавязак. Але на працягу ўсёй сустрэчы, дзе выступалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і вайны ў Іспаніі, яго не пакідала пачуццё прыкрасці і злосці на прызыўнікоў, на чыіх тварах, акрамя раўнадушша і адкрытай нуды, нічога не было. Абураўся: каму і навошта тут гавораць аб вытоках інтэрнацыяналізму і яго сіле? Ці патрэбны ім сказаныя на дарогу словы?

— Тады я не стрымаўся: «Хлопцы, вам жа ўсім хочацца спаць, я ж разумею». Але і іх абвінавачваць нельга,— працягвае Алег.— Яны нічога яшчэ не ведаюць. Я і сам да службы ў арміі не быў залатым...

Атрымліваецца, каб разабрацца ў самім сабе, у адносінах да людзей і жыцця, неабходна кожнаму прайсці праз «свой» Афганістан?

— Наша рэспубліка на адным з першых месц па ваенна-патрыятычнаму выхаванню,— пачаў адказ на гэта пытанне Юрый Бацян.— Але пачынаць выхаванне пачуцця патрыятызму ў школе — ці не надта позна? Ды і не ў стане школа працаваць адасоблена. Калі чалавек дажыў да васемнаццаці гадоў і не ведае, што такое праца, калі ён усё жыццё адчуваў надзейныя рукі бацькоў, сумняваюся, ці дапаможа яму наглядная агітацыя і шматлікія сустрэчы з ветэранамі.

Шмат расказаў пачулі ў гэты вечар студэнты з Афганістана аб руху воінаў-інтэрнацыяналістаў ў Савецкім Саюзе. Прадстаўнікі гарадскога клуба «Памяць» выязджалі ў мінулым годзе ў Ашхабад на першы Усесаюзны збор маладых воінаў запасу, дзе была выбрана Усесаюзная ініцыятыўная група. Старшыня клуба «Памяць» Павел Шацько стаў яе камісарам (на сустрэчу Паша прыйсці не змог — трапіў у шпіталь).

Яшчэ раз пераканалася, наколькі ілжывымі бываюць выступленні замежных прапагандыстаў, калі глядзела відэафільм, што прывезлі афганскія студэнты. Кадры, на якіх мільгаюць разбураныя школы, твары пакалечаных дзяцей... Асабліва запомнілася асляпляльнае неба і чарада галубоў. І студэнты з Афганістана, і нашы хлопцы ўсміхаліся, гледзячы на гэтых мірных птушак, што заўсёды былі ўвасабленнем чалавечай надзеі на мір і шчасце.

На Усходзе гавораць аб тым, што галоўнае для птушак, каб былі крылы, а для чалавека — сяброўства. Вечар, які адбыўся ў «Палітыкусе» — яркі штрых у карціне інтэрнацыянальнага братэрства двух народаў.

Ж. МІХАЙЛАВА, студэнтка факультэта журналістыкі.

ЮБІЛЕЙ

На роднай мове БЕЛАРУСАЎ

Віды ваколіц вёскі Мастаўляны. Тут ён нарадзіўся. Будынкі Свіслацкай гімназіі і Пецярбургскага універсітэта, дзе ён вучыўся. «Мужыцкая праўда» — першая нелегальная беларуская газета таго часу. Фатаграфіі В. Урублеўскага, А. Дамброўскага, А. Пацябні, В. Траугута і іншых паплечнікаў кіраўніка паўстання 1863 года ў Беларусі і Літве... Пэўна, хоціць пералічваць. Вы ўжо здагадаліся, што ў гэтым нумары рубрыка «Юбілей» расказвае пра народнага героя Кастуся Каліноўскага, чыёй памяці былі прысвечаны універсітэцкія гісторыка-літаратурныя чытанні.

XIX стагоддзе — час фарміравання новай сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Гэта перыяд, звязаны з імёнамі Ф. Багушэвіча і Д.-Марцінкевіча. XIX стагоддзе ў многім прадвызначалася паўстаннем 1863—1864 гг. Без перабольшвання можна сказаць, што новая беларуская літаратура, як і мова, на якой пісалася, па сваім пачатку «хрысцілася» ў агні паўстання на чале з Кастусём Каліноўскім.

Сем нумароў «Мужыцкай праўды» — першай беларускай нелегальнай газеты — засведчылі высокі ўзровень валодання беларускай мовай яе выдаўцом. Ён не вывучаў яе ні ў Свіслацкай гімназіі (пазней пераўтворанай у павятовае вучылішча), ні ў Пецярбургскім універсітэце. Беларуская мова была арганічнай, роднай мовай К. Каліноўскага. Мы ведаем, што ён нарадзіўся ў шматдзетнай (быў дванаццатым) сям'і беднага шляхціца, якая сваім жыццёвым узроўнем не адрознівалася ад серадняцкага сялянства. Выдзялялася хіба што толькі больш высокай адукацыяй. Варта нагадаць і такі факт. Як вядома, першая кніжка Д.-Марцінкевіча драма-ідылія «Сялянка» выйшла ў 1846 годзе, калі васьмігадовы Кастусь жыў у бацькоўскім фальварку Акушоўка. К 1855 г. (час паступлення ва універсітэт) у асяроддзі шляхты і сялянства чыталіся ўжо і «Гапон», і «Вечарніцы». Далучыўшыся да гэтай літаратуры, К. Каліноўскі добра ўсведамляў, што мова беларуская гэткая ж прыгожая, багатая і гнуткая, як і любая іншая з еўрапейскіх моў.

Мова газеты «Мужыцкая праўда» (1862—1863 гг.) уяўляе сабой у пэўнай ступені апрацаваную народную гаворку ва ўсёй сукупнасці яе характэрных рыс. «Мужыцкая праўда» засведчыла шырокія семантычныя і стылістычныя магчымасці беларускай мовы. Ад высокай патэтыкі да слоў нізкага гучання — такі дыяпазон мовы аўтара. Побач з такімі тыповымі (магчыма, і стылізаванымі) народна-гутарковымі формамі слоў, як французы (замест французы), Свістаполь (Севастопаль), некрут (рэкрут), маніхвест (маніфест), у мове «Мужыцкай праўды» адлюстравалася даволі значная колькасць тэрміналагічнай лексікі (асэсар, губернатар, казначэйства, камісар, маніфест, пасрэднік, сенат, спраўнік, чыноўнік і інш.). Шырока карыстаецца аўтар такімі вобразна-выяўленчымі сродкамі, як эпітэт (праўда горка, шчасце нябеснае), параўнанне (суды маскоўскія — гэта воўчая яма; як свет шырокі, кроў пальецца; цар як гэты воўк), устойлівыя звароты (дзяруць астатнюю кашулю, дабіціся да куска хлеба; цярпеў крыжовыя мукі; пайшлі з дымам хаты; аддаць на вечныя мукі).

Структурна кожны з нумароў газеты падзяляецца на тры часткі.

Пачатак нумара напісаны ў газетна-публіцыстычным стылі. Тут аўтар з пафасам узнімае злабадзённыя пытанні, эмацыянальна і вобразна перадае кожную сваю думку:

«Дзецюкі!

Калі Бог стварыў усіх людзей вольнымі і ўсім даў адзінакую душу, дык скуль жа гэта ўзялося, што адзін марнуе ды і над людзьмі збыткуе, а другі, бедны паншчыну служыць, альбо аброкі ў казну плоціць?

Кожны па-свойму талкуе, на свой бок цягне. Цар кажа, што ён добра нам думаець, а паны кажуць, што яны добра думаюць нам зрабіце, а мужык бедны ад іх дабросці як прападаў, так прападае...» (№ 2).

У другой частцы аўтар у даходлівай форме тлумачыць тыя ці іншыя з'явы тагачаснай рэчаіснасці, на канкрэтна-жыццёвых прыкладах паказвае становішча беларусаў. Стыль апавядання з публіцыстычна-газетнага перахоодзіць у размоўна-апавядальны. Перад намі ўжо своеасаблівая гутарка, няспешнае апавяданне, дэталёвае, разгорнутае:

«Быў калісьці народ наш вольны і багаты. Не помняць гэтага нашыя бацькі і дзяды, але я вычытаў у старых ксенджках, што так калісьці бывала. Паншчыны тады ніякай не было. І няма чаго таму дзівавацца, бо было лесу шмат, поля колькі хочаш, а людзей жа мала, дык нашто ж служыць паншчыну за зямлю, калі кожны мог лесу выцерабіць, хату сабе паставіць і меці сваё поле...» (№ 2).

У заключнай частцы тон апавядання зноў мяняецца. Газеты звычайна заканчваюцца палымянымі заклікамі да беларускага народа ўзняцца на барацьбу за сваё вызваленне:

«...няма чаго ждаці ад нікога, бо той толькі жне, хто пасее. Дык сейце ж, Дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою, не шкадуйце працы — каб і мужык быў чалавекам вольным, як на цалюткім свеце» (№ 3);

«Дзяры з нас, Цар, дзярыце з нас, чыноўнікі ягоныя, хаця да астатняй скуры; але памятайце, што і на вас прыйдзе пара, што калі мужык разгуляецца, то як свет шырокі, кроў ваша пальецца!» (№ 4).

Напісаная страсна і эмацыянальна, шчыра і даверліва, адлітая ў жывых і пякучых словах, «Мужыцкая праўда» К. Каліноўскага стала не толькі маніфестам народнага змагання за волю. Яна выявіла незвычайны талент публіцыста, палымянага трыбуна народных дум і спадзяванняў — К. Каліноўскага — Яскі-гаспадара з-пад Вільні. «Мужыцкая праўда» з'явілася школай і ўзорам выпрацоўкі новай беларускай літаратурнай мовы — народна-размоўнай у сваёй аснове.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ,
дацэнт кафедры
беларускай мовы.

З ДАЛЁКІХ ПАДАРОЖЖАЎ

У сакаліным краі

«17 жніўня. Прачнуўся ў 11.30. Прыйшлося доўгі час спрачацца з Коцем: упарта не жадаў ён адмаўляцца ад гуся. Потым прачнуліся астатнія. Смажым рэшткі рысу. З жалем пазіраем, як нашы лыжкі знішчаюць згушчанае малако. Апошняе.

Каля 13.00. Я, Косця і Марына накіроўваемся на левы бераг. Да караля. Таццяну пакідаем за гаспадыню...»

Без каментарыяў вам цяжка будзе зразумець гэтыя запісы. Таму прапаную свае тлумачэнні.

КОЦЯ — маладое сакаляня-дзербнік, якое добрасумленна суправаджала нас у час шаснаццацідзённага падарожжа па рацэ Пыра-яха, што ў перакладзе з ненецкай мовы азначае «рака шчупакоў». Такое «імя» яно атрымала дзякуючы свайму лепшаму сябру — удзельніку экспедыцыі маскоўскаму дзевяцікласніку Канстанціну Алегавічу Цімафееву (чытайце ініцыялы ў рускім варыянце). Зараз Коця кватаруе ў аднаго з аматараў птушак — драпежнікаў у Маскве.

ГУСЯ мы адстрэлілі ўчора вечарам у навуковых мэтах. Пасля неабходных вымярэнняў і аналізу змесціва страўніка гусі і кулікі звычайна ішлі ў кацёл або даставаліся пражэрліваму Коцю.

КАРАЛЬ — невялікі, абгароджаны сеткай адсек для загону аленяў. Звычайна каля яго можна знайсці без асаблівай цяжкасці прыгожыя і моцныя галінкі рог аленяў.

Побач з каралем, сярод тундры, стаялі загружаныя нарты. Нашаму абурэнню не было канца. Даверлівы і сумленны народ гэтыя ненцы. Калі адпраўляюцца вясной з аленямі на поўнач, у Байдарацкую тундру, упакоўваюць усё, што спатрэбіцца толькі зімой, і прымацоўваюць маёмасць да нартаў. Спрадвеку існуе ў тундры не замацаваны ніякімі пячацямі закон — кануць рэчы без гаспадара дазваляе сабе хіба толькі мядзведзь.

Суровае жыццё чакае таго, хто пасяліўся ў тундры. Таму і адносіны паміж людзьмі заснаваны на даверы і добразычлівасці. Аднойчы нам давялося бачыць напаўгнілыя нарты, гаспадар якіх ужо некалькі гадоў як памёр. Да гэтае пары стаяць яны некранутымі.

Гэты раз нас сустрэлі адкрытыя скрынкі, раскіданае адзенне, кнігі... Усё зразумела: тут папрацавалі звяры на дзвюх нагах. Калі рака затрымае свой бег, скаваная магутным панцырам лёду, вернуцца сюды ненцы. Што падумаюць гэтыя людзі, якія паспадзяваліся на векавы вопыт сваіх продкаў, што жылі па спрадвечных законах тундры?

Нечаканыя госці пакінулі на беразе ракі частку свайго скарбу: гумавую падушку і насос. Няўжо турысты? У такім выпадку ўжо ў факторыі мы зможам сустрэцца з гэтымі злачынцамі. У тундры ніводны крок не застаецца незаўважаным.

Павольна рухаюцца наперад нашы байдаркі «Таймень» і «Калібры» да Бурыдана — каменнай брамы. Бурыдан — гэта імклівыя струмені, віры, падводныя ўцёсы. Па дарозе рабілі звычайны ўлік птушак, якія



сустракаліся нам. Асабліва многа было крахалёў.

Амаль увесь Бурыдан прайшлі без прыгод. А ў канцы... Са скалы сарваўся, напаўняючы звонкімі гукамі цясніну, сокал. Маё сэрца, сэрца арнітолага, здрыганулася: «Гэта ж сапсан!» Колькі раз у душы песціў я надзею аб гэтай сустрэчы! І, зразумела, выбіраючы сапсана сімвалам сваёй будучай дзейнасці, сіняй птушкай сваіх пошукаў, я не ўяўляў сабе, што сустрэча адбудзецца так нечакана.

САПСАН — другі па велічыні, пасля крэчата, сокал фауны свету. Сустракаецца вельмі рэдка. У Беларусі 3—4 пары жывуць у самых глухіх раёнах.

І вось з трывожным крыкам носіцца над намі птушка, а са скалы ляціць насустрач яшчэ адна. У яе грубейшы голас, ды і афарбоўка не такая кантрасная — самка. Магчыма, недзе побач знаходзяцца птушаняты. Калі сумленна, дзеля гэтай сустрэчы прайшоў я ўвесь нялёгкі шлях ад Мінска да Пыра-яхі, пакінуўшы незавершанымі назіранні за птушанятамі скапы ў Бярэзінскім біясферным запаведніку — аб'ектамі маёй будучай курсавой, каб паспець сюды, на поўнач, пакуль маладыя сапсаны яшчэ не адправіліся на захад за птушынымі чародамі.

Птушкі суправаджалі нас, пакуль не засталіся ззаду апошнія скалы. Тут, дзе каля берага сціхаюць віры Бурыдана, мы і паставілі палатку.

Праз паўгадзіны, каля 22.00 мы пераплылі на другі бераг у надзеі застаць ля старыцы гусей.

Нас сустрэла цішыня. Мноства слядоў, пер'я — і ніводнай птушкі. Хто ж іх распужаў? Абагнуўшы падкову затокі, мы заўважылі на беразе каляіны, што пакінулі гусеніцы ўсюдыхода, і рэшткі банкетавання механікаў: банкі з-пад згушчанага малака, тушонкі, смецце. Цывілізацыя. Магчыма таму так непакоіліся сапсаны. Шкада, што апынуўшыся на поўначы, людзі часам не толькі не адчуваюць сувязі з прыродай, але сваімі злачынствамі рвуць апошнія яе нітачкі. Затрымайся, чалавек: як гукнеш, так і адгукнецца.

Прыцямнела. Мы з Косцем выйшлі з лагера, каб знайсці месца для назірання за гняздом сапсана. Ішлі на крык сокала. Спрабавалі зірнуць уверх на карнізы скал. Дарэмна. І ўсё ж да лагера вярталіся з цвёрдай упэўненасцю, што заўтра абавязкова знойдзем гняздо. Так і не давялося. Але птушаня бачылі. Яно ўжо добра лятала. Я ж паспеў за два дні ўбачыць сапсана, які вяртаўся дамоў са здабычай. Нават назіраў за ім нейкі час, трымаючыся рукамі за стойкі засідкі, што павісла на плячах. Бурна рэагаваў на зялёную горку, якая рухалася са спыненнямі (гэта было маё маскіровачнае адзенне), сапсан на другім беразе ракі. Ён адзін вінаваты ў тым, што птушка знікла, так і не пакінуўшы «аўтографа» на плёнцы майго фотаружжа.

У суправаджэнні чаек-халеяў, чые крыкі ў гэтым месцы ракі нагадвалі чалавечыя, мы накіраваліся на сустрэчу з новымі нечаканасцямі, якія падрыхтаваў у гэтым сезоне Ямал.

А. ВІНЧЭЎСКІ,
студэнт біялагічнага
факультэта.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

18 лютага

Зак. 1610.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.